**_МГА «ГІСТОРЫКА» (Менск)_**
**_БЕЛАРУСКІ АРХІЎ ВУСНАЙ ГІСТОРЫІ (Менск)_**
**_ІНСТЫТУТ СЛАВІСТЫКІ ПОЛЬСКАЙ АКАДЭМІІ НАВУК (Варшава)_**
**_ЛЯТУЧЫ ЎНІВЕРСІТЭТ (Менск)_**

Запрашаюць да ўдзелу ў міжнароднай навуковай канферэнцыі

**_«Чарнобыльская аварыя і грамадства: 30 год пасля катастрофы»_**
**_(Менск, 15-16 красавіка 2016 г.)_**

Трыццацігоддзе аварыі на Чарнобыльскай АЭС павінна стаць нагодай для пэўнай “інвентарызацыі” нашых ведаў па праблеме чалавека і грамадства ў “постчарнобыльскім свеце” і, магчыма, для вызначэння новых накірункаў даследаванняў. Не сакрэт, што па шэрагу прычын гэтая катастрофа і яе наступствы ў Беларусі аказаліся адсунутымі на перыферыю грамадскай і навуковай зацікаўленасці. Аднак, як паказалі даследаванні Беларускага архіва вуснай гісторыі (2015), Чарнобыль па-ранейшаму адгукаецца вялікім болем у памяці тых, каго закранула гэтая трагедыя. Адначасна яна падкрэслівае значэнне сацыяльных і гуманітарных навук, а таксама адказнасць навукоўцаў за тое, што адбываецца з чалавекам і грамадствам у сітуацыі глабальнай катастрофы.

Запрашаем навукоўцаў паспрабаваць адказаць на наступныя пытанні:

- Якія сацыяльныя і палітычныя наступствы мела аварыя на Чарнобыльскай АЭС для грамадства Беларусі і ўсяго постсавецкага рэгіёну?

- Як паўплывала гэтая аварыя на развіццё сацыяльных і гуманітарных навук?

- Як Чарнобыльская катастрофа і яе наступствы адлюстраваліся ў памяці і культуры народаў Беларусі, Украіны і Расіі?

Канферэнцыя будзе мець шматдысцыплінарны характар. Мы разлічваем на ўдзел у ёй гісторыкаў, культуролагаў, палітолагаў, сацыёлагаў, літаратуразнаўцаў, а таксама прадстаўнікоў іншых сацыяльных і гуманітарных навук.

Плануецца праца двух сесій:

- **_Чалавек, грамадства, дзяржава праз 30 год пасля Чарнобыльскай катастрофы_**

- **_Памяць і рэфлексія: Чарнобыль у люстэрках памяці і культуры_**

Працоўныя мовы канферэнцыі – беларуская, украінская, руская, польская і англійская.

Заяўкі на ўдзел просім дасылаць да **31 студзеня 2016 г.** на адрас: kanferencyja@nashapamiac.org. У заяўцы трэба пазначыць навуковую ступень, месца працы, тэму даклада і тэзісы (не больш 2 тыс. знакаў), кантактны тэлефон і адрас электроннай паштовай скрыні.

Аргкамітэт пакідае за сабой права адбору заявак. Матэрыялы канферэнцыі будуць апублікаваныя. Арганізатары кампенсуюць выдаткі на праезд і пражыванне ўдзельнікаў канферэнцыі.

***Просім пераслаць інфармацыю ўсім зацікаўленым асобам.***

*Аргкамітэт канферэнцыі:*
*Доктар гіст. навук Алесь Смалянчук,*
*Мгр Уладзімір Валодзін*
*Мгр Ганна Кавалёва*
*Мгр Андрэй Мастыка*
*Павел Сітнік*